свята памінавання продкаў "Дзяды".

Культавая аснова была тым асяроддзем, у якім вырастала купальская карнавалізацыя. Гэта было тое паэтычнае ўспрыманне жыцця, якое мела гратэскавы густ. Купальскі карнавал - гэта гульня гратэскавых вобразаў, якія існуюць непасрэдна, шчыра паміж зялёных дрэў, траў, кветак. Паэтычны вобраз добрага купальскага дзеда з кошыкам кветак папараці таксама звязан з фантастычнымі прадстаўленнямі. Акрамя таго у паказах русалак, калдуноў, чараўніц, усялякай нечасці ёсць нешта пераасэнсаванае ад культа продкаў. У беларускай купальскай традыцыі прагляддваецца далекая сувязь паміж ачышчальным рытуалам выгнання смерці і паказам фараоавых пахаванняў.

Такім чынам, элементы карнавалізацыі купальскіх абрадаў, тэатралізаваныя дзеянні, хараводы, гульні, рысы народнай пантамімы складаюць адзінае зборальнае паняцце "Купалле".

Свята гэта, як крыніца духоўнай культуры беларусаў, іграе вялікую ролю у адраджэнні народных свят.

## БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР, ЯК АСНОВА СТВАРЭННЯ СУЧАСНАГА НАРОДНАГА СВЯТА

А.Г.Фядотаў

Значныя змены, якія адбываюцца у духоўным жыцці рэспублікі, кранулі і святочную культуру Беларусі. Разам з адраджэннем мовы, сваей праўдзівай гісторыі да нас вяртаецца сапраўдная народная культура - песні, гульні, легенды, паданні. Адзін з накірункаў працы нашай кафедры, гэта стварэнне народных святаў на падставе легенды і падання. Гэтыя старадаўнія гісторыі складалі своеасаблівую сістэму маральных каардынат, якою карысталіся наступныя пакаленні, каштоўнейшы вопыт, які выхоўваў душу, дапамагаў чалавеку зрабіць правільны выбар у складаных жыццевых сітуацыях.

Рэжысер свята мае рэдкую магчымасць перанесці запісання на паперы легенды і паданні у самы гушчар сеняшняга жыцця і увасобіўшы у тэатралізаваную форму данесці да людзей іх эстэтычную і маральную каштоўнасць. І справа не у вонкавых рысах адлюстра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання легенды у свяце, а у пранікненні у яе сэнсавую сутнасць.

Задача пастаноўшчыка, апрацаваўшы гістарычны матэрыял і вызначыўшы асноўныя маральныя аспекты легенды, прайсці зваротны шлях ад ліста паперы да натуральных дзеючых персанажаў, але гэтая дзейнасць павінна знайсці вобразнае вырашэнне. Гэта патрабуе ад рэжысера грунтоўнага вывучэння сацыяльнага асяроддзя, рэгіянальных звычаяў і вераванняў, а таксама шэрагу іканаграфічнага матэрыяла.

Распрацоўваючы фактычны матэрыял легенды трэба вызначыць яе асноўныя сэнсавыя дамінанты, якія будуць эмацыянальнымі індыкатарамі пры стварэнні асобных блокаў будучага свята.

Асобнай распрацоўкі патрабуе сімволіка і аксэсуары свята, яго музычнае і мастацкае вырашэнне. Канчатковая задача аўтара свята - усе грунтоўна распрацавання, вобразна вырашаныя фрагменты легенды ці падання аб'яднаць у адзінае гарманічнае цэлае - свята.

Свята, створанае на падставе фальклорных крыніц, узбагачае людзей духоўна, выхоўвае годнасць за сваю зямлю і цесна яднае нас з нашымі продкамі, маральныя каштоўнасці якіх прыходзяць да нас са старажытных легенд і паданняў.

## ВЫКАРЫСТАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

Б.І.Бранавіцкі
А.А.Маркевіч

Мова - гэта не толькі элемент нацыянальнай культуры, гэта аснова для любой дзейнасці, якая мае дачыненне да культуры. У стварэнні культурных каштоўнасцей мове адводзіцца асобная роля. Як найвышэйшая форма выражэння сутнасці чалавека, мова тлумачыць акружаючы нас свет з дапамогай сімвалаў. Менавіта моўны знак дазваляе устанавіць сувязь паміж чалавекам і акружаючай яго рэчаіснасцю, паміж чалавекам і культурай. Гэта сувязь, разуменне аднаго чалавека другім ёсць сацыяльна-культурная з'ява.

Сённяшнее развіцце і станаўленне беларускай нацыі немагчыма